# БЕЛАРУСКІЯ АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

*УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт"*

*Вабішчэвіч Г.А., 3к., 2гр., МПФ*

*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Спрадвеку народныя песні і музыка былі неад'емныя ад грамадскага і сямейнага быту. Песень існавала багата, былі яны розныя па зместу. У народных песнях адлюстраваны ідэалы, працоўная дзейнасць, любоў да роднага краю, глыбокія пачуцці, мастацкія здольнасці беларускага народа.

Асабова вызначыліся абрадавыя песні: радзінныя (хрэсьбінныя), вясельныя, калядныя, велікодныя, купальскія, дажынкавыя. Нашы продкі спявалі песні ў буднія і святочныя дні, у час вячорак, працы на ніве і сенакосе, па дарозе ў лес па грыбы і ягады, з любой нагоды і проста "для душы". Былі сярод гэтых песень жартоўныя, вясёлыя і сумныя, прыгожыя і мілагучныя, поўныя хараства і задору.

Асноўная галіна беларускай народнай музыкі – песнятворчасць. Яна характарызуецца, перш-наперш, жанравай разнастайнасцю і багаццем меладычных тыпаў традыцыйных каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых песень.

КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Беларуская каляндарна-абрадавая творчасць як з'ява нацыянальна-адметная, са сваёй лексічна-вобразнай структурай, жанравай і ладава-інтанацыйнай спецыфікай склалася не пазней XIV – XVI стст. Паэзія беларускага земляробчага календара ўключае звыш 20 жанравых і групавых песенных разнавіднасцяў. Яна буйна развілася, добра захавалася і складае своеасаблівы феномен беларускай нацыянальнай паэтычна-песеннай культуры. Вылучаюцца 4 вялікія цыклы гэтай паэзіі: **веснавы, летні, восеньскі і зімовы**. Кожная пара года, кожны сезонна-вытворчы перыяд у сялянскім календары мелі адпаведныя ім абрады, звычаі, павер'і, песеннае суправаджэнне. Агульнае ў іх – шырокая аграрная аснова, мэтавая ўстаноўка, асобныя матывы, што вынікалі з яе. Усе каляндарныя абрадава-песенныя комплексы былі прасякнутыя думай пра будучыню роду, клопатамі пра тое, каб у найспрыяльнейшы час засеяць ніву, захаваць ураджай ад стыхіяў, статак – ад памору і дзікіх звяроў. Аднак толькі гэтай, галоўнай, функцыяй змест не вычэрпваўся. Мела яна і гулліва-пацешлівае прызначэнне, немалую эстэтычную вартасць. Пры пераемнасці некаторых абрадавых элементаў, пераклічцы асобных матываў кожны песенна-каляндарны цыкл вызначаецца разнастайнасцю і своеасаблівай непаўторнасцю.

**Зімовы перыяд** у сялянскім календары меў падрыхтоўчы характар.



Репозиторий ГрГМУ

Абрадавыя песні зімовага цыкла былі накіраваныя на тое, каб загадзя паўплываць на будучы ўраджай, захаваць азімы пасеў, рунь на палях. У зімовым перыядзе паэтычнага календара насычанасцю абрадавых песень вылучаліся святкаванне беднай куцці, калядаў (25 снежня с. ст.), шчадрухі – багатай куцці ў пярэдадзень Новага года. Шмат увагі аддавалася аграрнай і любоўнай варажбе, розным гаспадарчым павер'ям і прыкметам. Найбольш цікавымі ў зімовым цыкле з'яўляюцца *калядныя песні*. Яны захавалі амаль да нашага часу сляды магічнай функцыі – садзейнічаць ураджаю і дабрабыту ў сялянскай гаспадарцы. Прызначэннем калядных песень як часткі каляднага абраду ў старажытнасці было наблізіць надыход сонечнага цяпла (ад Каляд "сонца паварочваецца на лета") і забяспечыць багаты ўраджай у новым гаспадарчым годзе. Урадлівасць і багацце ў песнях падаюцца гіпербалізавана, а карціны прыроды набываюць часам касмічныя формы ("Ходзіць-паходзіць месяц па небу, кліча-пакліча зоры з сабою").

На мяжы зімовага і веснавога цыклаў развіліся масленічныя песні. Масленічныя абрадавыя песні мелі прызначэнне наблізіць вясну, перадавалі гуллівы настрой удзельнікаў святкавання.

**Веснавыя абрадавыя песні** былі закліканыя асвячаць асабліва адказны перыяд у жыцці земляроба – пачатак палявых прац, час веснавых усходаў, выгану скаціны на пашу. Валачобныя песні – від веснавых песень, віншавальна-велічальныя творы, з якімі хадзілі валачобнікі. У старажытнасці валачобны абрад меў аграрна-магічны сэнс, пазней ён набыў характар вясёлай забавы. У такім выглядзе ён бытуе ў некаторых вёсках і зараз. У аснове гэтых міфалагічных уяўленняў ляжыць вера ў магічную моц слова, калі шчодрым зычаннем можна наблізіць чаканае, мару да рэчаіснасці. Валачобны гурт складаўся з запявалы, падпявальнікаў, музыкі (з музычным інструментам) і інш. Большасць валачобных песень звернута да гаспадара сядзібы – галоўнай постаці ў земляробстве. "Жыта яго ядрыстае. Ядрыстае каласістае. Да адной мяжы нахілілася – свайму гаспадару пакланілася". Тыповымі былі прыпевы: "Вясна красна на дварэ!", "Зялёны сад вішнёвы!", "Хай так будзе". Яны перадавалі радасць, светлы настрой, якім прасякнуты ўсе песні.

**Летнія абрадавыя песні** павінны былі зберагчы збажыну ў пару даспявання, паспрыяць паспяховаму збору ўраджаю. Абрады, звычаі, павер'і, легенды Купалля нясуць на сабе адбітак глыбокай даўніны, маляўнічыя паводле зместу і формы. Паэтычным хараством вылучаюцца купальскія песні, звязаныя з язычніцкім культам раслін і анімастычным светапоглядам старажытных людзей. У народнай купальскай паэзіі адлюстравалася радасць чалавека – сведкі найвышэйшага росквіту прыроды, зямнога плёну, яго імкненне кахаць, быць шчаслівым: "На Купала сонца гуляла", "Ой рана на Йвана" і г.д. Купальскія і пятроўскія песні пранікнёна паэтызуюць хараство прыроды ў час яе найбольшага росквіту, ствараюць поўныя пяшчоты і першароднай чысціні дзявочыя вобразы. Невялікую групу ў летнім цыкле складаюць песні касецкія, або



Репозиторий ГрГПУ

сенакосныя. Уласна летнімі, паводле сталай народнай традыцыі, лічацца жніўныя песні з іх разнавіднасцямі – зажынкавымі і дажынкавымі. Жніўныя песні непасрэдна перадаюць атмасферу самай гарачай пары года ў жыцці сялянскай сям'і – жніва, цяжкай, у мінулым паднявольнай працы, перажыванняў. Важны момант летняга цыкла – дажынкі і звязаныя з імі песні.

**Восеньскі перыяд** земляробчага календара быў бедны на абрады. Ён звязаны з уборкай ураджаю, рваннем і апрацоўкаю льну, сяўбою азімых – заканчэннем палявых прац. Сярод восеньскіх святаў вылучаліся пакровы, багач і асабліва змітраўскія дзяды – асяніны, прысвечаныя ўшанаванню памяці продкаў. Падчас трох сезонна-вытворчых перыядаў – веснавога, летняга і восеньскага – бытавалі талочныя песні (песні працоўнай узаемадапамогі). Разам з валачобнымі і восеньскімі яны складаюць нацыянальную спецыфіку паэзіі беларускага земляробчага календара.

## СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Сямейна-абрадавая паэзія была непасрэдна звязана з важнейшымі падзеямі ў жыцці чалавека – нараджэннем, уступленнем у шлюб і смерцю. Яна вызначаецца надзвычай багатым ідэйна-тэматычным зместам і дасканалай мастацкай формай.

Спецыфіку беларускай сямейна-абрадавай паэзіі складаюць вуснапаэтычныя творы, якія выконваюцца ў час сямейнай урачыстасці, прысвечанай **нараджэнню дзіцяці (хрэсьбін)**. У час хрэсьбін выконваліся песні, прыпеўкі, прыгаворы. Найболып пашыранымі былі песні, у якіх выказваліся пажаданні шчаслівай долі нованароджанаму, слāвілася парадзіха-маці, велічаўся бацька дзіцяці, ушаноўвалася бабка-павітуха, ухваляліся ці высмейваліся ўзаемаадносіны кума і кумы і інш. Песні пра кума і куму мелі нярэдка жартоўна-эратычны характар. Шмат выконвалася застольных і бяседных песень, звязаных і не звязаных з абрадам. Увогуле ж функцыянальнае прызначэнне хрэсьбінных, як і іншых абрадавых песень, змянялася. У старажытнасці дамінантнай у іх была магічная функцыя. Абрады і звязаныя з імі песні, на думку выканаўцаў, павінны былі садзейнічаць лепшай долі нованароджанага. Пазней жа магічная функцыя ў гэтых абрадах і песнях адышла на другі план, галоўную ролю набыла эстэтычна-мастацкая функцыя.

У беларускім фальклоры асабліва багата прадстаўлена **вясельная паэзія**. Як і ў радзінных, у вясельных абрадах найбольшае месца займалі песні. Вясельныя песні суправаджалі ўсе асноўныя этапы вяселля: сватанне, заручыны, падрыхтоўку і пячэнне караваю, пасад нявесты, вясельную бяседу, ад'езд да маладога, урачыстае застолле ў хаце жаніха і інш. Акрамя песень, якія адлюстроўвалі падзеі, звязаныя з уступленнем у шлюб, на вяселлі спявалася і шмат песень, што мелі толькі ўскоснае дачыненне да абраду або зусім не мелі ніякіх адносін да яго. У мастацкіх вобразах гэтых песень своеасабліва паэтызавалася паўсядзённае жыццё



Репозиторий ГрГМУ

народа, яго быт, духоўны свет чалавека.

У вясельных песнях паэтызуюцца і велічаюцца жаніх і нявеста – галоўныя вобразы значнай часткі гэтых народных твораў. Жаніх часам паўстае ў вобразе князя, які едзе з дружынай, баярамі, нявеста ж называецца княгіняй. Гэта – імкненне паэтычна ўславіць, узвялічыць і ідэалізаваць у вясельных песнях галоўных дзеючых асоб шлюбнай урачыстасці. З дапамогай маляўнічых параўнанняў і іншых мастацкіх сродкаў песня стварае ідэальныя вобразы маладога і маладой, паказвае іх незвычайную прыгажосць. Часта для паэтызацыі маладых выкарыстоўваюцца вобразы сонца, месяца, зорак. У выніку шматвяковай традыцыі выпрацавалася багатая сімволіка, якая ярка характарызуе герояў вяселля.

Вясельным песням, як і ўсяму абраду, раней надавалася ўтылітарна-магічная роля – з дапамогаю слова і адпаведных дзеянняў спрыяць шчасліваму жыццю маладых. Але песня і многія яе сімвалы з цягам часу адарваліся ад абраду і пачалі ўспрымацца па-іншаму, з гумарам. Гумар вясельнай паэзіі ў сваёй аснове мяккі, добразычлівы, праз яго тонка раскрываюцца вобразы герояў шлюбнай урачыстасці.

Нельга ўявіць беларускае вяселле без жартоўных і сатырычных песень і прыпевак, у якіх асабліва даставалася свату і сваццi, дружкам, каравайніцам, а часам нават жаніху і нявесце. У абмалёўцы вобразаў свата і сваццi шырока ўжываліся гратэск і гіпербала. У адной з песень, напрыклад, іранічна малюецца такі партрэт свата: «Сват наш вельмі харош, а ў свата доўгі буслаў нос, а ў свата лыса галава, да казіна рыжа барада»; сват «плавае па хаце, як таран, лыпае вачыма, як баран».

Беларускія шлюбныя абрады і вясельныя песні мелі шмат агульнага з адпаведнымі рускімі і ўкраінскімі абрадамі і песнямі, што сведчыць аб блізкасці поглядаў, эстэтычных патрабаванняў і аб цесных культурных узаемасувязях усходнеславянскіх народаў. Спецыфічныя нацыянальныя рысы беларускага вяселля ярка выяўляліся ў народным гумары, у драматызаваных жартоўных сцэнках, якія ўваходзілі ў вялікую вясельную «гульню».

Да сямейна-абрадавай паэзіі належаць хаўтурныя галашэнні – імправізаваныя творы, у якіх шырока выкарыстоўваліся традыцыйныя мастацкія сродкі фальклору для выказвання смутку і гора з выпадку смерці роднага чалавека. Галашэнні грунтаваліся на веры ў бессмяротнасць душы, на ўяўленнях аб тым, што чалавек і пасля смерці можа дапамагаць ці шкодзіць жывым. Гэта былі імправізаваныя творы, у якіх гучалі смутак і гора, глыбокі жаль з выпадку смерці роднага ці блізкага чалавека.Для гэтых твораў характэрна эпічнасць апавядання: у адных расказваецца пра цяжкі жыццёвы шлях селяніна, у другіх малюецца карціна горкага існавання беднай удавы з дзеткамі-сіротамі і інш. Паэтыка беларускіх хаўтурных галашэнняў багатая на разнастайныя выяўленчыя сродкі. Яны эмацыянальна насычаныя. Укладваючы ў словы ўсю ласку і выказваючы гора і глыбокі смутак, маці называе свае



Репозиторий ГрГМУ

памершае дзіця «лісточкам зялёненькім», «цвяточкам чырвоненькім», «яблычкам недаспелым», «салавейкам шэранькім».

Спіс літаратуры

1. http://library.by/portalus/modules/belarus/show_archives.php
2. http://www.knihi.com/Bielaruskija_narodnyja_piesni/
3. http://spadchyna.net/music/index.php
4. http://www.zaslaue.by/news.php
5. http://www.gants-region.info

## МАХТУМКУЛИ – НАЦИОНАЛЬНЫЙ ТУРКМЕНСКИЙ ПОЭТ

*УО «Гродненский государственный медицинский университет»*

*Валиев Б., 1к., 1гр., ФИУ*

*Кафедра русского и белорусского языков*
*Научный руководитель – заведующая кафедрой Мельникова А.А.*

Национальным туркменским поэтом является Махтумкули (1730-1880-е годы). До Махтумкули туркменская поэзия бала очень похожа на персидскую, то есть выражена в форме суфийских философских трактатов в поэтической форме. Махтумкули и его последователи начали творить, выходя за узкие рамки условностей, свойственных персидской поэзии. При этом широко использовались мотивы туркменской народной поэзии и её эпические традиции. Продолжателями наследия Махтумкули считаются Сеитназар Сеиди (1775-1836) и Курбандурды Зелили (1780-1836).

Махтумкули – туркменский поэт XVIII в., писавший под псевдонимом «Фраги». Годы рождения и смерти неизвестны, но о нём немало сведений в рукописных источниках и народных преданиях. Основываясь на них, можно предположить, что Махтумкули родился в конце 1720-х либо в начале 1730-х в Туркменистане в районе Кара-Кала. Его отцом был известный поэт и религиозный мыслитель Довлеет-Мамед Азади (1700-1760), оказавший серьёзное влияние на сына.

Рос Махтумкули на берегах рек Гурген и Атрек, в местах, где долгое время жили туркмены (сам Махтумкули происходил из племени гоклен). Первоначально посещал сельскую школу, где его отец был учителем, но, наделённый немалыми способностями и упорством, Махтумкули рано прошёл курс начальной школы, начал помогать отцу по хозяйству, пас скот, обрабатывал землю. Позднее стал отменным ювелиром, серебряных дел мастером. Дальнейшее образование получил в городах Керки и Бухара, завершив его в городе Хиве в медресе



Репозиторий ГрГМУ